Ідзе падпіска на «Народную Волю»
на снежань і першую палову 2016 года. Будзем разам!

№ 88 (4033)

10 лістапада 2015 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

На простор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

БЕЗ РУЖОВЫХ АКУЛЯРАЎ

Аляксандр КЛАСКОЎСКІ
спецыяльна для "Народнай Волі"

...Асуджаная на дэградацыю

Уяўляю, якімі клоўнамі пачуваюцца беларускія ўрадоўцы перад місіяй МВФ, што пачала працаваць у Мінску 9 лістапада. Бо, каб атрымаць ад фонду крэдыт на тры мільярды долараў, трэба пакласці на бочку праграму структурных рэформаў, прычым змацаваную гарантыямі на самым высокім узроўні. Між тым галоўны беларускі начальнік, выступаючы на ўласнай інаўгурацыі ў мінулую пятніцу, змяшаў ідэю тых рэформаў з брудам.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, рэформы нам падкідваюць ворагі, што хочуць скрышыць палітычны лад. Ён заклікае развіваць існуючую беларускую мадэль. Між тым яна на вачах "згортваецца": сёлета за дзевяць месяцаў валавы ўнутраны прадукт упаў на 3,7%, сярэдні заробак у верасні апусціўся да 389 долараў, хоць яшчэ напрыканцы 2014 года перавышаў 620 долараў.

Гэта не развіццё, а класічная дэградацыя, паўтор дэградацыі савецкай сістэмы. Спрабаваць удыхнуць новае жыццё ў казённую эканоміку (у тым ліку праз прымітыўна трактаваную мадэрнізацыю) – тое самае, што сцябаць дохлага каня. "Беларуская мадэль" трымалася на індустрыяльнай базе часоў СССР, нафтавай дурніцы ад Расіі. Выпетраў стары прамысловы патэнцыял, скончылася дурніца – і тая мадэль капітальна села на мель, як некалі савецкая эканоміка. Без рэформаў, даводзяць сёння Мінску крэдыторы, з ямы не выкараскацца.

Беларускі кіраўнік прывык, што яму шалёна шанцуе, што праблемы неяк рассмоктваюцца (ну і плюс пераканаўся, што "народзец" надта ж цярплівы). Але зараз дурніцы не будзе. Расія – жыватворная крыніца субсідый для беларускага рэжыму – надоўга апынулася ў рэцэсіі, адраджэння нафтавага афшору Мінск не дачакаецца ўжо ніколі.

Зрэшты, калі Лукашэнка наракае, што эканамічныя рэформы пагражаюць палітычнаму ладу Беларусі, ён мае рацыю. Пераўтварэнні базісу рана ці позна закрануць і надбудову. Такім чынам, гаворка ідзе пра рызыкі для жорсткай аўтакратыі, якую першы прэзідэнт адбудаваў у сінявокай краіне дзеля ўтрымання свайго крэсла. І заява на інаўгурацыі, што ён гатовы служыць народу да апошніх дзён, чытаецца адназначна: пасаду Лукашэнка нікому не збіраецца саступаць да свайго фізічнага канца, а мо і спадзяецца перадаць у спадчыну.

Іначай кажучы, афіцыйны кіраўнік, разважаючы пра рэформы, найперш пераймаецца за лёс уласнага самадзяржаўя, фактычна створанай манархіі.

І гэта азначае, што інтарэсы нязменнага прэзідэнта прыйшлі ў жорсткую супярэчнасць з інтарэсамі развіцця Беларусі, якое немагчыма без трансфармацыі эканамічнага (а ў перспектыве, натуральна, і палітычнага) ладу.

Чаму ж народ не абураецца і не выходзіць на вуліцы? Праблема не толькі ў сілавым кулаку рэжыму. Ягоны правадыр іграе на патэрналізме ладнай часткі беларусаў, іх боязі перамен. Кіроўныя вярхі, прапаганда спекулююць на ўкраінскіх падзеях: во, бачыце, захацелі паўднёвыя суседзі ў Еўропу – у выніку кроў, разадраная краіна.

Беларусам нахабна хлусяць пра нейкі сусветны крызіс, хоць і ў ЗША, і ў Еўрасаюзе, і ў Кітаі эканоміка расце, у мінусе збольшага толькі постсавецкія аўтакратыі, што з'ядналіся ў застойны Еўразійскі эканамічны саюз.

У прамове на інаўгурацыі Лукашэнка палохаў суайчыннікаў жахамі капіталізму. Але дастаткова зірнуць на Польшчу, што перамучылася ў свой час рэформамі. Некалі палякі змяталі ўсё з нашых прылаўкаў, сёння ж беларусам беластоцкія крамы падаюцца казкай – такія там выбар і цэны. У нас жа нармальнага капіталізму няма, а вось жахлівая абдзіралаўка – на кожным кроку. Дзе тая бясплатная адукацыя, якой казырае галоўны начальнік? Вывучыць студэнта сёння азначае для многіх бацькоў пакласці зубы на паліцу. І так у многім: ад сацыяльнай дзяржавы, давайце адкрыта скажам, засталася адна назва.

І гэта толькі кветачкі, бо дзеля грошай ад замежных крэдытораў улады, пэўна ж, пойдуць на рэзкае павышэнне кошту камуналкі, праезду ў транспарце. Беларусы атрымаюць шок без тэрапіі.

Хтосьці кажа: дэмакратыю на хлеб не намажаш. Але ж відавочна, што самыя развітыя краіны свету – гэта менавіта дэмакратыі. Зрэшты, гісторыя мае і прыклады "дыктатур развіцця". Іспанскі каўдыльё Франка на пачатку 1960-х даў тэхнакратам магчымасць разняволіць эканоміку, што забяспечыла яго краіне імклівы рост. З галечы на пік сусветнага дабрабыту вывеў Сінгапур жалезнай рукой Лі Куан Ю.

Але праўда і тое, што эканамічнае развіццё падточвае рэжым. Лукашэнка выдатна гэта адчувае, і таму наіўна чакаць, што пасля 21 года кіроўнага рэтраградства ён ператворыцца ў беларускага Лі Куан Ю. Лукашэнка хоча руляваць усім. І таму беларусам пры яго кіраванні наканавана "дыктатура дэградацыі". Калі ў самога народа не стане волі змяніць ходу падзей.

«ЛІСТАПАД-2015»



Падчас адкрыцця кінафестывалю «Лістапад-2015». *(Працяг тэмы на 8-й стар.)*

ДЗІКУНСТВА

Юрыст Тамара Сяргей і актывісты грамадскай ініцыятывы «Супраць беззаконнасці ў пракуратуры і судах» у мінулую пятніцу хацелі трапіць на інаўгурацыю Аляксандра Лукашэнкі, а апынуліся ў міліцэйскім пастарунку



Тамара Сяргей *(на пярэднім плане)*.

Праваабаронцу Тамару Сяргей, якая дапамагае звычайным беларусам у адстойванні сваіх правоў, абвінавацілі ў... рабаўніцтве.

– Сітуацыя ад пачатку выклікала шэраг пытанняў і выглядала як брудная правакацыя, – кажа Тамара. – Напярэдадні інаўгурацыі мы не змаглі патрапіць на прыём да намесніка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Валерыя Міцкевіча, які курыруе пытанні судоў і пракуратуры. Ён прымае грамадзян толькі раз у тры (!) месяцы. Мы загадзя падалі калектыўную заяву на прыём, але 5 лістапада Міцкевіч прыняў толькі траіх наведвальнікаў. Нам было адмоўлена ў сустрэчы. І тады я прапанавала нашым актывістам пайсці 6 лістапада на інаўгурацыю прэзідэнта, паспрабаваць перадаць калектыўную заяву – 43-ю па ліку – асабіста Лукашэнку.

Дамаўляліся мы 5-га ўвечары па тэлефонах. Сустрэчу прызначылі 6 лістапада на 10 раніцы ў Мінску на чыгуначным вакзале.

Я спазнілася, прыбегла на вакзал у 10.15. І літаральна адразу ж да нас падышоў... падпалкоўнік міліцыі (як стала вядома пазней, Гаркові Сяргей Валер'евіч) і старшы прапаршчык Махнач Сяргей Іванавіч. З імі дзяўчына, па выглядзе – чалавек, залежны ад наркотыкаў ці алкаголю: блукаючыя вочы, шэры твар, скурчаная фігура... Яна кіўнула ў наш бок і спакойна, без якіх-небудзь эмоцый у голасе сказала: «Яны забралі ў мяне кашалёк. Там апошнія грошы». А яшчэ праз пару секунд паказала на мяне, сказаўшы, што гэта я забрала кашалёк.

Падпалкоўнік тут жа папрасіў мяне прайсці з імі ў аддзяленне. Я не супраціўлялася, жанчынам сваім прапанавала: «Вы едзьце і дзейнічайце па нашым плане». І што вы думаеце – іх тут жа затрымалі. "Ахвяра" ўжо сцвярджала, што грошы я забрала адкрыта і перадала ім…

Пратрымалі ўсіх у пастарунку каля 4 гадзін. Ніякага кашалька ў маіх рэчах не знайшлі. Спачатку склалі пратакол аб маім затрыманні, потым пастанову аб вызваленні. Крымінальную справу не завялі, сказалі, што будуць праводзіць праверку. Хаця я настойвала, што вакзал – гэта людное месца, усюды вісяць відэакамеры і праверыць мае перамяшчэнні нескладана. Тым больш што ў пратаколе затрымання было напісана, што мяне падазраюць у тым, што «*06.11.2015 у 10.00, знаходзячыся на трэцім паверсе чыгуначнага вакзала Мінск-пасажырскі ў Кастрычніцкім раёне г.Мінска, адкрыта выкрала ў Тарасавай Т.М. грашовыя сродкі ў памеры 300 долараў ЗША*". Але я прыйшла на вакзал на пачатку адзінаццатай, у 10.00 мяне там дакладна не было!

Вось такія суцэльныя нестыкоўкі...

– Вы можаце падаць сустрэчную заяву – на вас узвялі паклёп... Даведаецеся, што гэта за дзяўчына, чым займаецца.

– У любой сітуацыі ў мяне ёсць права азнаёміцца з матэрыяламі праверкі. Ёсць і іншыя правы, пра якія я зараз не хацела б гаварыць, але якімі я буду карыстацца... Падпалкоўніку Гарковаму я сказала, што з ім мы, напэўна, яшчэ сустрэнемся…

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

АНТЫРЭКОРД

Беларусы перасталі хадзіць на футбол

Беларускія аматары футбола перасталі хадзіць на матчы сваіх каманд. Такую выснову пацвярджае статыстыка, якая абнародавана паводле вынікаў чэмпіянату Беларусі ў Вышэйшай лізе. У прыватнасці, сярэдняя наведвальнасць кожнага з матчаў чэмпіянату Беларусі ў сезоне-2015 склала... 1709 гледачоў. Гэты паказчык з'яўляецца антырэкордным за ўсю гісторыю правядзення турніру.

АДПАЧЫНАК-2015

Без Егіпта беларусы жыць не могуць

Нягледзячы на тое, что ў Егіпце разбіўся расійскі самалёт, большая частка беларускіх турыстаў не збіраецца адмаўляцца ад паездак у гэтую краіну.

Пасля таго як Расія 6 лістапада спыніла ўсе рэйсы ў Егіпет да высвятлення прычын авіякатастрофы самалёта A321, у досыць нязручным становішчы аказаліся многія беларусы, якія збіраліся ляцець у Егіпет праз Маскву.

"*У выхадныя дні склалася напружаная сітуацыя*, – распавёў "Народнай Волі" дырэктар фірмы "Тайм Ваяж" (адна са спецыялізацый кампаніі – продаж пуцёвак расійскіх тураператараў з вылетам з Масквы, у тым ліку ў Егіпет) Руслан СЕГЯНЮК. – *Аб тым, што Расія прыпыняе авіяпалёты ў Егіпет, стала вядома ў пятніцу вечарам, не ўсе тураператары своечасова праінфармавалі пра гэта турыстаў, якія з'язджаліся ў Маскву. У гэтым, скажам так, і была нязручнасць. Але 90 працэнтаў нашых турыстаў з Масквы паехалі па альтэрнатыўных накірунках, якія ім прапанавалі. У асноўным – у Турцыю. Тыя ж, хто вярнуўся ў Мінск, зараз з намі на сувязі. Хтосьці выбірае іншы варыянт, нехта жадае абавязкова ў Егіпет, але на больш позні тэрмін. Што тычыцца тых нашых турыстаў, якія ляцяць у Егіпет з Мінска ці Кіева, то, паводле маёй інфармацыі, самалёты перапоўнены. А ўвогуле, сітуацыя ў хуткім часе зноў можа нармалізавацца. Можна меркаваць, што палёты ў Егіпет Расія прыпыніла прыкладна на два тыдні*".

У фірмах, якія прадаюць пуцёўкі ў Егіпет з вылетам з Мінска, адзначаюць, што запланаваныя авіярэйсы адбываюцца па графіку. Калі ж хтосьці з турыстаў жадае адмовіцца ад паездкі, то аператар гатовы "перакінуць" грошы на іншы накірунак.

Алесь СІВЫ.

АФІЦЫЙНА

Як паведаміў дырэктар дэпартамента па турызме Мінспорту і турызму **Вадзім Кармазін**, ад паездкі ў Егіпет адмаўляюцца не больш за 2% беларускіх турыстаў.

СІТУАЦЫЯ

Беларускія букмекеры не хочуць гуляць па новых правілах

Праект закона "Аб унясенні дапаўненняў і зьмяненняў у Падатковы кодэкс Рэспублікі Беларусь" прадугледжвае ўвядзенне 4-працэнтнага падатку на даходы фізічных асоб з выйгрышаў, якія атрыманы ад арганізатараў азартных гульняў.

На думку букмекераў, увядзенне гэтага падатку прыцясняе эканамічныя інтарэсы ігракоў і будзе мець даволі негатыўныя наступствы для ўсяго ігорнага бізнесу.

Не так даўно адбыліся сустрэчы ініцыятыўнай групы, у якую ўвайшлі прадстаўнікі вядучых букмекерскіх кантор краіны. У выніку з'явіўся калектыўны зварот, які быў накіраваны ў розныя высокія дзяржаўныя органы.

"*Увядзенне падатку на любыя грашовыя выплаты прывядзе да таго, што асноўная маса ігракоў перастане гуляць у букмекерскіх канторах – юрыдычных асобах Рэспублікі Беларусі, а пойдзе на інтэрнэт-сайты нерэзідэнтаў, дзе выйгрышы выплачваюць без падатковых выплат*, – напісалі аўтары ліста. – *Гэта прывядзе да адтоку валюты, зніжэння паступлення падаткаў у бюджэт, паўстане пытанне рэнтабельнасці букмекерскага бізнесу...*"

Букмекеры просяць дапрацаваць дакумент з улікам меркаванняў усіх зацікаўленых бакоў.

"*Запрашэнне да абмеркавання прафесіяналаў у сферы букмекерскага бізнесу – адзіна правільны шлях ва ўдасканаленні заканадаўства*", – дадаюць яны.

Ці прыслухаюцца дзяржаўныя чыноўнікі да букмекераў? Можна зрабіць на гэта стаўкі, пакуль яшчэ падатак не ўвялі…

Алесь СІВЫ.

ПРАЕКТ

Масква і Мінск: свет у канцы тунэля?

Станкабудаўнічыя прадпрыемствы знаходзяцца не проста ў цяжкім, а ў крытычным стане, і ўчора з'явілася навіна, якая можа стаць для іх светам у канцы тунэля.

Расія і Беларусь створаць адзіную інжынірынгавую кампанію – інтэгратара па развіцці станкаінструментальнай прамысловасці. Пра гэта стала вядома падчас наведвання Мінскага станкабудаўнічага завода першым намеснікам міністра прамысловасці і гандлю Расіі **Глебам Нікіціным**. Беларускі бок прадстаўляў міністр прамысловасці краіны **Віталь Воўк**.

З расійскага боку ў холдынг маюць намер увайсці ТАА «Группа Стан», МГТУ«Станкин», з беларускага – холдынг«Белстанкаінструмент» і ААТ «Мінскі электратэхнічны завод імя Казлова».

ЖУРНАЛИСТСКОЕ РАССЛЕДОВАНИЕ

Чиновники борются с импортом лекарств в ущерб здоровью белорусов?

После Нового года из белорусских аптек могут исчезнуть многие препараты иностранного производства. Такое опасение высказывают дистрибьюторы. Говорят о списках импортных препаратов, на пути которых в Беларусь поставлены административные препоны. Якобы в этом перечне – наиболее популярные у населения лекарства.
Не случится ли так, что в один прекрасный день мы поймем, что возможности выбирать, чем лечиться, у нас уже нет?
«Народная Воля» попыталась в этом разобраться.

«Могу предложить белорусский аналог»

В аптеке на улице Матусевича немноголюдно. Стильно одетая женщина у окошка возмущается: «Это уже третья аптека, где я не могу купить «Климонорм»! Неужели опять придется заказывать в России?!» Провизор, видимо, привыкшая к возмущениям посетителей, вежливо советует поискать препарат в другой аптеке. «А еще лучше – узнавайте по справке, где есть лекарство, и езжайте туда», – советует фармацевт.

Следующая посетительница называет лекарства, которые нужны ей. Из списка в наличии оказывается только несколько препаратов. «Гроприносина» нет, вместо «Лазолвана» провизор советует взять отечественные таблетки от кашля «Амброксол», детские капли в нос «Ринофлуимуцил» остались в количестве одной бутылочки. Подумав, женщина-покупатель говорит: «Давайте всё, что есть из списка, по две штуки» И, как бы оправдываясь, поясняет: «Сезон простуд начинается. Ребенок у мамы, а в райцентре уже давно перебои с поставками импортных лекарств, да и стоят они там дороже, чем в Минске».

В другой аптеке, уже на улице Захарова, наблюдаю почти такую же картину.

Чихающая девушка хочет купить «Фервекс», фармацевт разводит руками: «Могу предложить белорусский аналог «Гростудин». Но предупреждаю: многие пациенты жалуются на его качество. Есть «Терафлю», но стоит 149 тысяч». «Нимесила» и «Пиносола» в аптеке нет. Не находится на полках и французских таблеток от давления «Престариум» – их спрашивал еще один посетитель. Семейная пара забирает последнюю упаковку антибиотика «Авелокс», правда, со словами благодарности: «У вас еще по старой цене – 437 тысяч 400 рублей. А в аптеке по улице Козлова такая же упаковка стоит уже 534.700 рублей».

Провизоры на вопрос, почему в аптеке нет того или иного препарата, отвечают стандартно: «Нет поставок, когда завезут, не знаем…» Заведующая одной из аптек сети «Минская Фармация" только на условиях анонимности объясняет, почему так часто в последнее время возникает дефицит импортных лекарств:

– *Потому что поставки импорта в государственные аптеки уже давно существенно сокращены. Около 60% нашего ассортимента – это белоруссие лекарства. Нам практически не поставляют импортных препаратов, если есть белорусские аналоги. Импорт, который заменить нечем, завозят. Но и его количество ограничено. Вот сейчас начался сезон простуд. Мы получили капли "Пиносол", их размели буквально за два дня. Покупатели, конечно, возмущаются, и их понять можно. В Минске можно пойти в частную аптеку и купить там, а что делать жителям маленьких райцентров, деревень, где ближайшие частные аптеки за 100 километров? Их, по сути, лишили выбора, чем лечиться.*

Диагноз – импортозамещение

Активное замещение импортных лекарств их белорусскими аналогами наблюдается в Беларуси на протяжении последних 7 лет. Еще в 2008 году в нашей стране был взят курс на импортозамещение в фармакологии. Власти тогда решили: зачем тратить огромные бюджетные средства и вывозить из страны валюту, закупая лекарства за границей, если эти деньги можно вложить в создание новых производственных мощностей и полностью удовлетворить больницы и поликлиники отечественными лекарствами.

Планы заявлялись грандиозные. И, стоит отметить, сработала отрасль неплохо. В 2008 году в Беларуси реализовывалось только 550 наименований отечественных лекарственных препаратов, а сейчас их 1,5 тысячи! Сегодня от всего количества лекарственных средств, зарегистрированных на территории Беларуси, отечественные таблетки, мази и иные формы составляют 30 процентов (1,5 тысячи из 5 тысяч зарегистрированных). Только в этом году на рынке должно появиться 140 новых лекарственных препаратов (115 уже выпускаются).

Но только 40% от производимых в стране лекарств идет на экспорт. Продаем лекарства в Россию, Украину, Казахстан, лишь небольшие партии удается отправлять в страны Балтии, Болгарию, Словакию, Иран и т.д. Остальное, естественно, поставляем на внутренний рынок, прежде всего в больницы и поликлиники.

Чиновники сегодня гордо заявляют: 90 (!) процентов лекарств, которыми лечат пациентов в районных больницах, сделаны в Беларуси. Даже в ведущих РНПЦ страны соотношение лекарственных средств "белорусские/импортные" составляет 55% на 45%. В 2009 году из бюджета страны на закупку импортных лекарств было потрачено 409,5 миллиона долларов, в 2010-м — 401,5 миллиона долларов (причем около 350 миллионов шли на закупку препаратов из Европы, США, Японии). А в прошлом году –внимание! – Минздрав заявлял о закупке лекарств за рубежом всего лишь на сумму 80 миллионов долларов.

Недавно столичным больницам и республиканским центрам Минздрав в очередной раз предложил пересмотреть перечень лекарств, которые медучреждения обязаны иметь в наличии. Естественно, предлагается еще больше сократить присутствие импорта.

– *Рациональное зерно в этом есть*, – говорит заведующий отделением одной из столичных клиник на условиях анонимности. – *Есть импортные препараты, без которых можно обойтись. Например, все клиники страны имеют «Актовегин». Хотя медики давно говорят о слабой эффективности и даже бесполезности этого препарата. Однако Минздрав упорно его закупает. В открытом доступе есть статистика: в 2013 году на закупку «Актовегина» из бюджета было потрачено 9,65 млн долларов, в 2014-м – 8,1 миллион, за 9 месяцев этого года – около 4 млн долларов. А, например, 5 миллионов долларов на закупку препаратов для противорецидивной терапии для больных рассеянным склерозом в стране нет. А эти лекарства могли бы значительно улучшать качество жизни таких пациентов и отодвигать смерть.*

Что касается тотального перехода на белорусское... Посмотрите на соседние Литву, Польшу – когда там перешли на европейские протоколы лечения, смертность от сердечно-сосудистых заболеваний упала в 2 раза. Потому что в лечении используются эффективные препараты, которые имеют доказательную базу.

(Окончание на 3-й стр.)

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА



Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

А вы, друзья, как ни садитесь…

В ноябре 2011 года, когда вовсю бушевал доморощенный валютный кризис, когда белорусский рубль девальвировался чуть ли не в трехкратно, а цены выросли более чем в два раза, Лукашенко дал «отлуп» рыночным предложениям тогдашнего премьера Мясниковича и вице-премьера Румаса. Последние, вероятно, пришли к пониманию, что надо хоть что-то сделать. Но услышали от босса, что «придется и впредь вручную регулировать некоторые процессы». В итоге и по сей день все ключевые вопросы решаются в экономике единолично им, то есть вручную. Хотя из ближайшего окружения все громче и громче звучат голоса о необходимости проведения реформ.

Заместитель главы Администрации президента Снопков сделал ряд смелых заявлений. Что белорусская экономика в нынешнем состоянии долго не протянет, что назрели две ключевые реформы – разделение функций государства как регулятора и собственника, а также переход от директивного планирования к индикативному, когда предприятиям показатели будут доводиться не как обязательные для выполнения, а как рекомендуемые. Он признал, что у правительства, исполкомов, министерств разобщенные цели и «использование на данный момент вертикали как одного из основных элементов нашего общества, к сожалению, не приносит того эффекта, на который мы могли бы рассчитывать». С ним легко можно согласиться. Директивные методы, к примеру, привели к рекордным сверхнормативным складским запасам готовой продукции, к омертвлению капитала, к отсутствию «оборотки» на предприятиях.

Помощник президента Рудый в своих заявлениях и статьях подвергает довольно резкой критике сегодняшнее ее ручное регулирование [illegible]

[illegible]

Ни одна из предложенных реформ [illegible] Только надеждою по Крылову: «А вы, друзья, как ни садитесь, все в музыканты не годитесь».

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

Імя Пупейкі – Аляксандр

Рэдакцыя газеты "Народная Воля" ўдзячна прытрымліваецца правіла: любая дапушчаная недакладнасць павінна быць выпраўлена. Таму і паправім да артыкула "Адзін з патрыётаў", які надрукаваны ў мінулым нумары. На жаль, у ім [illegible] імя бізнесмена Пупейкі, які [illegible] за мяжу. Яго завуць Аляксандр, а не Анатоль, як выпадкова напісана ў матэрыяле.

ГЕНЕРАЛИТЕТ



Александр МЕЖУЕВ:

«Мне обидно, когда парламент называют мертвым…»

Бывший госсекретарь Совета безопасности Беларуси генерал-майор Александр Межуев вернулся в Палату представителей. Правда, если раньше он возглавлял комиссию по национальной безопасности, то сейчас является просто ее рядовым членом. Александр Вениаминович рассказал «Народной Воле» о том, почему ему не нравится белорусская оппозиция и что, по его мнению, сегодня больше всего волнует простых людей.

Напомним, что в должности госсекретаря Совбеза Межуев продержался меньше двух лет – он был назначен 5 декабря 2013 года, а 24 июня 2015 года А.Лукашенко удовлетворил его прошение об освобождении от должности *«в связи со сложными семейными обстоятельствами»*. Сейчас в жизни Александра Вениаминовича все более-менее наладилось, он снова стал появляться на публике. «Все в порядке!» – по-армейски четко и уверенно отвечает генерал.

– О том, что ушел с важной должности, ничуть не жалеете?

– А чего жалеть? – говорит он. – Я как человек военный [illegible]

– На одном из последних заседаний Палаты представителей с участием правительства вы обратили внимание на проблему высоких кредитных ставок госбанков и предложили [illegible] в отношении предприятий, выпускающих социально значимую продукцию. Почему эта тема вас взволновала?

– Потому что ситуация напрямую касается моего избирательного округа. Я был на одном из предприятий, общался с руководством, мы эту тему обсуждали, поэтому я и акцентировал внимание на проблеме.

Кстати, я не только с директорским корпусом встречаюсь, но и с простыми людьми много общаюсь. Знаю, что почти всех [illegible] волнуют вопросы, связанные с работой, зарплатой, строительством жилья, системой здравоохранения и транспортом. Это то, о чем говорят все.

– Бытует мнение, что нынешние депутаты ни на что не могут повлиять. Мол, Палата представителей – сплошь выдвиженцы власти…

– Почему? [illegible]

– В любой другой стране – да, но у нас, я бы сказал, мертвый парламент. Настоящих дискуссий нет, депутаты никакой инициативы не проявляют…

– Да глупости это все! [illegible] вычитывают, доказывают, анализируют…

– Все равно не могу с вами до конца согласиться. У нас закон о бюджете страны за 20 минут принимают! Знаю, что некоторые депутаты не то что в цифры и расчеты не вникают, они эти бюджетные тома даже в руки не берут. Голосуют «За!» да и все.

– Может, и было такое когда-то, но сейчас пятый созыв Палаты представителей – один из самых профессиональных. Нормальный парламент, где теория сочетается с практикой, умные люди пришли в Палату представителей. Я серьезно вам говорю.

И мне обидно, когда говорят «мертвый парламент», «назначенные люди». [illegible]

– А кто у вас был конкурентом?

– Преподаватель Вильнюсского университета, минчанин, оппозиционер. [illegible]

– А как вам кажется, в предложениях оппозиции все-таки есть какое-то рациональное зерно?

– Каждый зарабатывает деньги по-разному. Один у станка день стоит, второй восемь часов в поле, [illegible]

Марина КОКТЫШ.

ТАК ДУМАЮ

Няма чаго паказаць…

Як толькі з'явілася Палата прадстаўнікоў цяперашняга склікання і як толькі яе старшынёй быў абраны Уладзімір Андрэйчанка, ён публічна заявіў пра тое, што дыскусіі дэпутатаў па самых вострых пытаннях будуць транслявацца ў прамым эфіры тэлеканалаў.

Дзякуй Богу, часу прайшло дастаткова – у наступным годзе ўжо будуць новыя выбары. І дзе тыя дэбаты?

[illegible]

Пётр ЛУБІЦКІ.

Мінск.

ЧУЛІ?

XIV Мінскі форум пераносіцца

Адразу пасля таго, як стала вядома пра тое, што ў сваёй інаўгурацыйнай прамове Аляксандр Лукашэнка паведаміў: "Рэформаў не будзе…", – прыйшла і другая навіна.

Мінскі форум, які праводзіцца з 1997 года Нямецка-беларускім таварыствам як пляцоўка для сустрэч інвестараў, палітыкаў і навукоўцаў дзвюх краін, у гэтым годзе не адбудзецца.

Пра гэта стала вядома з ліста, разасланага старшынёй форуму Райнерам Ліндерам яго ўдзельнікам.

«Дарагія сябры, у сувязі з кароткатэрміновымі праблемамі планавання з беларускага боку мы павінны, на жаль, перанесці XIV Мінскі форум на 2016 год. Мне вельмі шкада, і я спадзяюся, што ў вас не ўзнікла ніякіх нязручнасцяў, звязаных з вашым удзелам у Форуме», – паведаміў старшыня Нямецка-беларускага таварыства, прафесар Райнер Ліндэр.

Пра новую дату Форуму ў 2016 годзе стане вядома пазней.

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ

Станислав ЗАСЬ:

«Неплохо, если наши дети с малых лет будут жить в атмосфере белорусской культуры и традиций…»

На днях А.Лукашенко назначил генерал-майора Станислава Засю госсекретарем Совета безопасности. До этого времени он лишь исполнял обязанности госсекретаря.

Станиславу Засю 51 год. Родился он в Украине. Окончил Бакинское высшее общевойсковое командное училище, Военную академию Беларуси и российскую Военную академию Генштаба. Служил не только в Вооруженных силах, но и в МВД и КГБ.

Последние семь лет был заместителем госсекретаря Совета безопасности. Кроме того, Станислав Зась – кандидат военных наук.

В одной из своих публикаций в журнале «Беларуская думка» Станислав Зась написал: *«Свою историю, традиции и обычаи надо бережно хранить, а вот культуру и духовно-нравственные ценности – нести людям. Задача эта общая для всех. Ведь она объединяет государство и общество. Будет неплохо, если наши дети с малых лет будут жить в атмосфере белорусской культуры и традиций, где есть место нашим национальным играм, костюмам, песням, литературе и кино. Разумеется, нельзя ограничивать их доступ к культурным ценностям других наций и народов. Но свою самобытность надо охранять».*

ОФИЦИАЛЬНО

Чем занимается госсекретарь?

В ноябре 1991 года председатель Верховного Совета Республики Беларусь Станислав Шушкевич подписал постановление *"Об образовании Совета безопасности Республики Беларусь"*.

В состав Совбеза входило 14 человек, в том числе министры, руководство Верховного Совета, командующий войсками и другие. Аппарат Совета безопасности состоял из пяти человек – помощника председателя Совбеза и четырех сотрудников аппарата, работающих на постоянной основе. Сегодня в составе Совбеза 19 человек. В 2010 году в состав Совбеза был включен помощник президента Виктор Лукашенко.

5 августа 1994 года А.Лукашенко подписал указ "О создании Совета безопасности Республики Беларусь" в целях *"обеспечения реализации функций Президента Республики Беларусь по управлению государством, формированию внутренней, внешней и военной политики в области безопасности, по сохранению государственного суверенитета, территориальной целостности и конституционного строя Республики Беларусь, поддержанию социально-политической стабильности в обществе, защите прав и свобод граждан"*.

Председателем Совета безопасности является президент. Формальное руководство Советом безопасности осуществляет госсекретарь.

Совет безопасности Республики Беларусь – высший координационно-политический орган страны. Он определяет военную политику Беларуси в области безопасности, стратегии, принципов военного строительства, обеспечения гарантированной защиты суверенитета, оборонного потенциала республики, ее экологического состояния, прав и свобод граждан.

В задачи Совбеза в мирное время входит формирование внешней и внутренней политики, разработка основных направлений военной доктрины, координация борьбы с преступностью и другими задачами, направленными на обеспечение безопасности в Беларуси.

Материально-техническое обеспечение деятельности Совета безопасности осуществляется в целевом порядке за счет средств республиканского бюджета. Финансирование деятельности аппарата Совета безопасности производится по отдельной строке в смете расходов Администрации президента Республики Беларусь.

В своих публичных выступлениях Лукашенко подчеркивал, что создавал Совбез по его личному поручению Виктор Шейман.

Какие задачи ставил перед Совбезом А.Лукашенко?

В 2005 году А.Лукашенко предложил Совбезу сформировать систему *"обеспечения информационной безопасности страны"*.

"Если кто-то думает, что обеспечением информационной безопасности должны заниматься теле- и радиоканалы, тот глубоко заблуждается, – цитировала Лукашенко пресс-служба. – *Прежде всего ее обеспечивают президент, правительство и главные координаторы — Администрация президента и Госсекретариат Совета безопасности"*.

В 2006 году Лукашенко говорил, что Совбез *"укомплектован достаточно профессиональными людьми"*, требуется лишь усилить *"антикоррупционную составляющую"*. Среди приоритетных задач этого органа называлось *"усиление борьбы с коррупцией в высших эшелонах государственной власти и управления"*.

В 2008 году Лукашенко заявил, что рассчитывает на кадровое укрепление этой структуры, отметив, что *"будут многократно усилены требования к работе Государственного секретариата Совета безопасности, которому необходимо придать серьезный дополнительный импульс и кардинально повысить его эффективность"*. *"Вы утратили чувство реальности*, – сказал Лукашенко. – *Свыклись с негативом и имеющимися проблемами, пускаете на самотек многие направления деятельности. Госсекретариат Совета безопасности должен не только контролировать, но и максимально повысить спрос, встряхнуть всю силовую и правоохранительную систему, значительно ее усовершенствовать и привести в соответствие с требованиями сегодняшнего дня. Не командовать, а координировать проведение политики президента в этих сферах"*.

В 2014 году Лукашенко потребовал усиления деятельности Госсекретариата Совета безопасности. *«Я уже как-то публично говорил о работе государственного секретариата Совета безопасности. Но это не значит – вот мы поговорили, и не должно быть движения в плане улучшения и усиления качества работы. Это уже состоявшаяся структура, которая существует 20 лет, это время, когда пора двигаться вперед более решительно, не боясь принимать какие-то более прогрессивные решения, вносить предложения и так далее»*.

Лукашенко сказал, что его настораживают некоторые вопросы дисциплины, особенно среди офицерского и даже генеральского корпуса в Министерстве обороны: «*Таких фактов предостаточно*». И подверг резкой критике и высказал претензии к качеству работы закрытой – так называемой правительственной – связи. *«Это не дело, когда говоришь с главой какого-то государства, и нормально поговорить невозможно. Поэтому есть также ряд претензий к этой сфере деятельности»*.

ПАЛІТКУХНЯ

«Чорны піяр» у дзеянні

Кіраўнік Белтэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька ў эфіры перадачы «Клуб рэдактараў» паказаў абразлівую карыкатуру на палітыка. Сюжэт такі: аголены мужчына-стрыптызёр, вельмі падобны на Анатоля Лябедзьку, круціцца на шосце перад жанчынай-касманаўтам, падобнай на Ангелу Меркель…

Ясна, што Ангеле Меркель гумар Давыдзькі – што слану драбіна. А ці не збіраецца Анатоль Лябедзька падаць у суд?

«Ведаеце, паміж мужчынамі гэта ўсё вырашаецца працей, – пажартаваў Лябедзька, – *калі б гэта было рэальным, з задавальненнем выклікаў бы Давыдзьку на рынг, але калі сур'ёзна, то я не лічу патрэбным праз гэта судзіцца. Усім і так вядома, што гэта за чалавек»*.

Таксама Анатоль Лябедзька падкрэсліў, што калі яго бесперапынна цкуюць на дзяржаўных каналах, то гэта значыць, што ён усё робіць правільна.

СУСЕДЗІ

Праз мяжу на… байдарцы

Паміж Беларуссю і Літвой з'явіцца пункт памежнага кантролю на рацэ.

З наступнага сезона на байдарках, каноэ, невялікіх катэрах або прагулачных суднах беларусы змогуць беспрашкодна хадзіць у Літву. Пра гэта піша партал DELFI са спасылкай на газету Lietuvos zinios. Для тых, хто вандруе па Нёмане на сродках воднага транспарту, будзе абсталяваны сезонны пункт рачнога памежнага кантролю "Швяндубрэ". Адкрыць пункт памежнага кантролю намячаецца ў канцы лістапада. Чакаецца, што гэты крок прастымулюе турызм – літоўскія турысты змогуць на суднах хадзіць у Гродна, а беларусы – у Друскенікі.

ГУЧНАЯ СПРАВА

Паўлоўскі сядзіць, яго бізнес працуе

Арышт члена Савета Рэспублікі Андрэя Паўлоўскага пакуль не адбіўся на ягоным бізнесе па вытворчасці кармавых дабавак. Фірма працуе і выступіла з заявай з нагоды арышту свайго заснавальніка.

ТАА "Біяком" гарантуе выкананне сваіх абавязацельстваў перад контрагентамі, гаворыцца ў заяве кіраўніцтва прадпрыемства, апублікаваным на афіцыйным сайце кампаніі ў сувязі з прад'яўленымі КДБ і дэпартаментам фінансавых расследаванняў КДК абвінавачаннямі заснавальніку кампаніі Андрэю Паўлоўскаму і яго калегам па бізнесе.

Як паведамлялася раней са спасылкай на прэс-службу КДБ, паводле папярэдніх ацэнак дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК толькі чатырма фірмамі з групы кампаній "Біяком" за апошнія гады не выплачаны падаткі не менш як на 144 мільярды рублёў. "Устаноўлена, што злачынная схема была распрацавана і рэалізоўвалася па ініцыятыве кіраўніцтва групы кампаній "Біяком" з задзейнічаннем шэрагу падкантрольных замежных камерцыйных структур з васьмі краін", – гаварылася ў заяве следчых.

"ТАА "Біяком" пацвярджае факт правядзення следчых дзеянняў у дачыненні да асноўнага заснавальніка і шэрагу службовых асоб кампаніі. Адначасова з гэтым ТАА "Біяком" запэўнівае, што правядзенне следчых дзеянняў ні ў якай меры не адаб'ецца на інтарэсах кліентаў, пастаўшчыкоў, падрадчыкаў і іншых партнёраў кампаніі як унутры краіны, так і за яе межамі, – гаворыцца ў заяве кампаніі. – На сённяшні дзень ТАА "Біяком" прадпрымае ўсе магчымыя намаганні для забеспячэння работы ў нармальным рэжыме. Кіраўніцтва і супрацоўнікі прадпрыемства разумеюць, што нават кароткатэрміновы перапынак у пастаўках прадукцыі і паслуг ТАА "Біяком", а таксама спецыялізаваных ТАА "Біяком Агра", ТАА "Біяком Тэхналогія" можа самым негатыўным чынам паўплываць на нармальны працоўны рытм больш як 700 прадпрыемстваў і арганізацый рэспублікі".

ТАА "Біяком" выказала ўпэўненасць ў аб'ектыўным разглядзе і спрыяльным вырашэнні сітуацыі, якая склалася. "Цяпер неабходна падрабязная і кампетэнтная ацэнка таго, што адбываецца, пасля мы будзем гатовы да больш разгорнутых публічных каментарыяў", – падкрэсліваюць у кіраўніцтве кампаніі.

Паводле інфармацыі кампаніі, Андрэй Паўлоўскі ініцыяваў і на сёння рэалізуе тры маштабныя інвестыцыйныя праекты. Праекты па будаўніцтве завода па перапрацоўцы сыроваткі і выпуску сыроватачна-тлушчавага канцэнтрату, а таксама завода па выпуску дзіцячага харчавання знаходзяцца ў высокай ступені завершанасці, адзначаецца ў заяве. "Паспяховы і своечасовы запуск дадзеных вытворчасцяў – гэта новая імпартазамяшчальная прадукцыя на рынку Рэспублікі Беларусь і новыя высокапрадукцыйныя працоўныя месцы", – падкрэсліваецца ў дакуменце.

СКАНДАЛ

Кнігі – знішчыць!

Учора на некалькіх сайтах з'явілася сенсацыя: чыноўнікі Міністэрства інфармацыі нібыта загадалі знішчыць тыраж кнігі палітолага Віталя Сіліцкага, якая была надрукавана пасля смерці аўтара. У ёй, бачыце, былы кіраўнік зарэгістраванага ў Вільнюсе Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў параўнаў рэжымы Слабадана Мілошавіча ў Югаславіі 1990-х і Аляксандра Лукашэнкі ў Беларусі.

Кніга называецца «Доўгая дарога ад тыраніі: посткамуністычны аўтарытарызм і барацьба за дэмакратыю ў Сербіі і Беларусі». Гэта не мастацкі і нават не дакументальны твор. Гэта навуковае паліталагічнае даследаванне. «*У вашых руках пасмяротная кніга Віталя Сіліцкага. Кніга, якую Віталь не дапісаў. Кніга – працяг даследавання «Адкладзеная свабода: посткамуністычны аўтарытарызм у Сербіі і Беларусі», якое публікавалася ў 2003 годзе ў часопісе «ARCHE» і было выдадзена асобнай кнігай у 2012 годзе па адыходзе Віталя*», – пазначана ў анатацыі.

У друкарні "Паліграфт", якая друкавала выданне, сцвярджаюць, што тыраж знішчаны па загадзе Міністэрства інфармацыі. Але пісьмовага загада нікому не паказваюць, і яго ніхто не бачыў. Магчыма, яго наогул не было, а спрацавала тэлефоннае права альбо вуснае ўказанне.

Дырэктар друкарні «Паліграфт» Фёдар Басько патлумачыў "Нашай Ніве": *"Нам сказалі, што калі гэтага не зробім, то друкарню зачыняць. Зрэшты, самі вінаваты – не глядзелі, што друкуем"*.

У той жа час нагадаем, што ў Беларусі афіцыйна дзейнічае канстытуцыйная норма аб свабодзе слова, а папярэдняя цэнзура забаронена. Таму на якой падставе знішчана кніга і наколькі гэта законна, сказаць цяжка. "Народная Воля" абавязкова вернецца да гэтай тэмы.

Віталь Сіліцкі – палітолаг, першы дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў. Ён памёр у 38 гадоў ад раку, кніга мелася стаць яго пасмяротным помнікам.

Ігар МАРОЗАЎ.

P.S. "Народная Воля" звязалася з начальнікам упраўлення прававой і кадравай работы Мініnфарма **Вікторыяй Мялешка**, якая сказала: *"Першы раз чую пра гэта, прозвішча Сіліцкага мне нічога не гаворыць. Калі б такі загад існаваў, то мы пра яго ведалі б…"*

КРЫМІНАЛ

Дык што з Юляй?

На мінулым тыдні "Народная Воля" і іншыя СМІ паведамілі пра знікненне чэмпіёнкі Беларусі ў спрынтарскім бегу Юліі Балыкінай і пра тое, што, на думку следчых, яна забіта.

По справе затрыманы былы малады чалавек спартсменкі. Ён прызнаўся, што забіў дзяўчыну і вывез цела ў лес. Але дзе закапаў труп, не памятае…

І вось ужо каторы дзень міліцыя і валанцёры з пошукава-выратавальнага атрада "Анёл" даследуюць лясы вакол Мінска. Пакуль Юлю Балыкіну не знайшлі.

ІНІЦЫЯТЫВА

«Матчын рух 328»

У Гродне адбыўся ўстаноўчы сход абласнога сацыяльна-асветніцкага грамадскага аб'яднання "Матчын рух 328". Маці, чые дзеці асуджаны паводле артыкула 328 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь ("Незаконны абарот наркатычных і псіхатропных рэчываў"), аб'ядноўваюцца дзеля абароны правоў сваіх дзяцей, многія з якіх, паводле меркавання родных і блізкіх, асуджаны незаконна.

Старшыня грамадскага аб'яднання **Ларыса Жыгар** лічыць, што жорсткія захады супрацоўнікаў праваахоўных і судовых устаноў у адносінах да абвінавачаных паводле артыкула 328 Крымінальнага кодэкса сталі галоўнай прычынай стварэння арганізацыі. "*Тэрміны пакарання сапраўды неймаверныя. 8 гадоў – гэта зараз вялікая рэдкасць. Звычайна даюць 10–18 гадоў! Наша задача зрабіць так, каб нас пачула ўлада*", – кажа яна.

Сацыяльна-асветніцкае грамадскае аб'яднанне "Матчын рух 328" мае на мэце таксама ажыццяўленне дзейнасці, накіраванай на садзейнічанне прафілактыкі ўжывання і распаўсюджвання наркотыкаў, прапаганду здаровага ладу жыцця, а таксама аказанне неабходнай дапамогі асуджаным і іх сем'ям.

УРАДЖАЙ-2015

І тут недабор

У Беларусі завяршаецца ўборка цукровых буракоў. Па стане на ўчарашні дзень быў убраны ўраджай з 96,8 тыс. га, або 98,3% ад плана.

Як паведаміла Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, усяго сабрана 3 млн 268 тыс. тон цукровых буракоў, што на 25,2% менш, чым на аналагічную дату мінулага года. Ураджайнасць менш леташняй і складае 334,1 ц/т супраць 463,7 ц/т.

ПАМЯЦЬ

Архівы ссыльных

У расійскай абласной дзяржаўнай казённай установе "Дзяржаўны архіў Томскай вобласці" вельмі шмат дакументаў па гісторыі ссылкі ўдзельнікаў паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гадоў на Беларусі ў Томскую губерню. Пра гэта паведаміла дырэктар архіва **Анастасія Караваева**.

"Па сваім характары дакументы ўяўляюць сабой артыкульныя спісы ссыльных, пратаколы допытаў удзельнікаў паўстанняў, інструкцыі, якія вызначаюць чарговасць перасялення ссыльных, просьбы ссыльных аб выдачы ім дапамогі, розныя даносы, фотаздымкі і тысячы іншых дакументаў", – сказала Анастасія Караваева.

ЖУРНАЛИСТСКОЕ РАССЛЕДОВАНИЕ

Чиновники борются с импортом лекарств в ущерб здоровью белорусов?

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Стоп-лист

Естественно, что столь активное импортозамещение лекарств не могло не сказаться и на ассортименте аптек. Безусловно, нет ничего плохого в том, что рядом с дорогими импортными препаратами соседствуют более дешевые белорусские аналоги и есть немало белорусских препаратов, которые устраивают население и по качеству, и по цене. Здоровую конкуренцию в любой сфере и тем более в фармации можно только приветствовать. Но у нас пока превалирует привычный административный нажим.

Какие только «указявки» не выходили из стен Минздрава за последние годы, только бы увеличить объемы продаж белорусских лекарств в аптечной сети! Рекомендательные письма врачам *«О принятии дополнительных мер, направленных на ограничение приобретения населением лекарственных средств импортного производства»*, настоятельные обращения к компаниям-поставщикам «*принимать действенные меры по ежегодному сокращению объема импорта синонимов отечественных средств*»… Уже все знают, что врачи в поликлиниках выписывают в первую очередь рецепты на белорусские лекарства, что популярных у населения таблеток или капель может не быть даже в частных аптеках и надо побегать по городу, чтобы их купить. Недавно Минздрав установил ежемесячный мониторинг продаж в аптеках (в том числе и частных), расположенных в шаговой доступности от центральных поликлиник, больниц, диспансеров, чтобы выяснить, насколько активно аптеки предлагают «купляць беларускае».

Но и этих мер, оказывается, недостаточно.

«С августа этого года работать стало еще сложнее, – говорит коммерческий директор компании, занимающейся оптовыми поставками импортных препаратов в Беларусь. – *Если так пойдет и дальше, то в новом году страна может остаться без многих импортных лекарств.*

Что сейчас происходит? Александр Лукашенко потребовал, чтобы выручка от продаж белорусских препаратов в Беларуси была такой же, как и от импортных, – 50 на 50. Чиновники щелкнули каблуками и бросились исполнять поручение. Хотя для всех, и в первую очередь для первых лиц Минздрава, очевидно, что, по сути, это невыполнимая задача. Потому что белорусская фармацевтическая промышленность производит дешевые генерики из недорогих субстанций – дешевые антибиотики, дешевые витамины, дешевые обезболивающие и т.д., средняя цена таблеток 1–3 доллара. Представляете, какие должны быть объемы продаж дешевых лекарств, чтобы иметь 50 процентов рынка в стоимостном выражении! Поэтому чиновники идут на разные ухищрения».

По словам собеседника, компаниям, занимающимся оптовыми поставками лекарств, в приказном порядке увеличены квоты на закупку белорусских препаратов: «*Завозишь в страну импорта на миллион долларов – будь добр на миллион закупи и белорусских лекарств. Раньше это соотношение было таким: 70 процентов – импорт, 30 процентов – белорусские аналоги. Сегодня склады некоторых компаний просто завалены белорусскими лекарствами, по полгода нет сбыта, фирмы не знают, что с ними делать. Зато Минздрав себе в статистику записал, что продажи отечественных препаратов увеличены».*

«Но и это еще не все, – утверждает наш собеседник. – *Дистрибьюторам и раньше рекомендовали меньше ввозить импорта, сокращать поставки препаратов, аналоги которых есть в Беларуси. Сейчас доходит до абсурда, только бы выполнить поручение президента. Уже даже те препараты, которые не производятся на территории Беларуси, но популярны у населения и хорошо продаются, по сути, запрещают. Составлен список импортных лекарств и спущен в контрольно-аналитические лаборатории, которым дано указание затягивать сертификацию новых поставок данных препаратов в Беларусь. Этот список дистрибьюторы называют между собой «стоп-листом», он появился в конце августа и нигде не опубликован. Но произошла утечка, и недавно фирмы, занимающиеся оптовыми поставками, его заимели».*

В списке, который показывает мой собеседник, более 300 препаратов ведущих мировых и европейских производителей. Есть препараты, у которых нет белорусских аналогов, есть те, которые входят в список жизненно важных. Это и антибиотики, и обезболивающие лекарства, таблетки и порошки, которые активно используются при заболеваниях желудочно-кишечного тракта, профилактики сердечно-сосудистых заболеваний, гипертензии, противопростудные и противоаллергические препараты. Вот только несколько наиболее известных, топовых лекарств из данного списка:

«Линекс», «Мезим», «Фестал», «Эссенциале Н» и «Эссенциале форте Н», «Де-нол», «Но-шпа», «Верошпирон», «Канефрон Н», «Троксевазин», «Авелокс», «Берлиприл», «Энам», «Нолипрел», «Лориста», «Флавамед», «Лазолван», «АЦЦ», «Биопарокс», «Ибуклин», «Фромилид УНО», «Диротон», «Церебролизин», «Кавинтон Форте», «Найз», «Кеторол», «МИГ», «Кардиомагнил», «Супрастин», «Цетрин», «Називин», «Виброцил», «Снуп», «Мастодинон», «Трихопол», «Полижинакс», «Терафлекс», «Седавит», «Ново-Пассит» и другие.

Немало в списке глазных капель – «Квинакс», «Тобрекс», «Офтаквикс», «Неванак», «Траватан», «Вигадекса», витаминов – «Дуовит», «Супрадин», «Элевит Пронаталь», «Пантовигар».

«Сегодня многие аптеки еще распродают остатки предыдущих партий, – говорит наш собеседник. – *А после Нового года в дефиците могут оказаться многие препараты. Сертификацию новой партии лекарств, ввезенной на территорию Беларуси, согласно постановлению Минздрава, лаборатория должна проводить 7–15 дней. А сегодня компании на некоторые препараты больше месяца не могут получить сертификат. Например, на «Линекс», «Мастодинон», «Тритаце» и другие. Все поставщики, дистрибьюторы об этом знают, и все боятся говорить, потому что Минздрав может лишить компанию лицензии, закрыть за какие-нибудь мелкие нарушения оптовые склады, аптеки.*

Но кому выгодна эта ситуация? Никому! Народ недоволен, потому что зачастую надо побегать по городу, чтобы купить нужное лекарство. Компании-поставщики несут убытки, с начала года продажи упали на 30 процентов, а при таком падении товарооборота говорить о прибыли не приходится. Значит, уменьшаются налоги, которые компании платят в бюджет, идет сокращение штатов, люди оказываются на улице.

В соцсетях уже есть объявления типа: привезем нужные лекарства из Вильнюса, доставка лекарств из России и т.д. Неужели наши правители не понимают: мы живем не в Томске, мы рядом с Европой. И народ поедет за лекарствами в Литву, Польшу, Россию. Деньги оставит там».

«Комментировать ничего не могу»

Неужели на самом деле существует такой «стоп-лист», тормозящий поставки импортных лекарственных средств в Беларусь? Звоню в Республиканскую контрольно-аналитическую лабораторию Центра экспертиз и испытаний в здравоохранении.

Заведующая лабораторией Ирина Майсак от каких-либо комментариев отказывается. Вежливо отвечает: «*По поводу этой информации, со всеми этими вопросами обращайтесь в Министерство здравоохранения. Я вам ничего не отвечу*».

С аналогичными вопросами обращаюсь в региональные лаборатории. Никто информацию компаний-поставщиков о «стоп-листе» не подтверждает, но и не опровергает. Например, с заведующей контрольно-аналитической лабораторией Гродно Галиной Скобейко у нас завязывается такой диалог :

– *Кто вам такое сказал* (что существует «стоп-лист»». – **Авт.**)? – спрашивает Галина Станиславовна.

– В одной оптовой компании.

– *Пусть оптовые компании и ответят, на основании чего они вам так сказали. Комментировать я ничего не могу. Они должны это подтвердить.*

– Мне предоставили этот список, этот «стоп-лист», как они его называют. Но я хотела бы уточнить непосредственно у вас, как у заведующей лабораторией, существует ли он?

– *Не могу ничего ответить на этот счет.*

– Но вы же знаете, есть в вашей лаборатории такой лист или нет?

– *Я вам объясняю: я не могу ничего вам ответить на такой вопрос. Такой вопрос я могу обсуждать только со своим руководством.*

– Речь идет о том, что этот «стоп-лист» находится непосредственно в лабораториях.

– *Я еще раз повторяю: я не могу с вами об этом говорить. Да, есть свои определенные сроки по прохождению контроля. Есть постановление Минздрава о проведении контроля качества лекарств. Есть еще административные процедуры, которыми мы тоже руководствуемся. Это наши документы, этим занимаются наши лаборатории. Каждое лекарство подвергается своему виду контроля.*

– Есть ли у вас примеры, когда партия поступивших импортных лекарств сертификацию проходит не 7–15 дней, а месяц и больше?

– *Комментировать я ничего не могу. Вам лучше обращаться к нашему руководству в Минск.*

На недавней пресс-конференции, которая была приурочена ко Дню работников фармацевтической промышленности, у заместителя директора Департамента фармацевтической промышленности Министерства здравоохранения Виктора Шеина журналисты поинтересовались, почему созданы негласные препятствия для ввоза в Беларусь импортных препаратов. Не случится ли так, что в новом году белорусы столкнутся с дефицитом импортных препаратов, что многих из них не будет даже в частных аптеках?

